КОНТРОЛЬНЫ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
___________________А.І.Жук
«_17_» _01_______________2025 г.
Рэгістрацыйны № УД31-1-99/2025/вуч.

# СУЧАСНАЕ ЗАМЕЖНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Вучэбная праграма
ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура)

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбнага плану па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), зацверджанага 23.02.2023, рэг. № 048 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Т.М.Тарасава, прафесар кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Г.К.Тычко, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар;
Н.У.Чайка, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ____________ Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 от 24.03.2025 г.)

Загадчык кафедры ________________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 ад 15.04 2025 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела БДПУ ______________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ___________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура).

«Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» знаёміць студэнтаў-філолагаў з тэарэтычнай і метадалагічнай асновай для вывучэння сучаснай беларускай літаратуры, а таксама для пераасэнсавання класічных твораў нацыянальнай літаратуры. Вывучэнне найноўшых дасягненняў замежнай літаратуразнаўчай навукі, у першую чаргу – знаёмства з найбольш прадуктыўнымі падыходамі да аналізу мастацкага тэксту могуць быць запатрабаваны студэнтамі пры напісанні літаратурна-крытычных работ, у прафесійнай ацэнцы і аналізе мастацкіх твораў.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» паспрыяе развіццю навыкаў пісьмовага афармлення сваіх поглядаў, фарміраванню ўменняў і навыкаў, неабходных для інтэрпрэтацыі і паглыбленага філалагічнага аналізу тэкстаў розных часавых эпох і тыпаў нацыянальных культур. Такім чынам, у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны будзе ажыццяўляцца фарміраванне ўстойлівай зацікаўленасці студэнтаў да выяўлення спецыфікі літаратурных з’яў і працэсаў, вывучэння працэсаў узаемадзеяння традыцый і наватарства, даследавання адметнасцей нацыянальных літаратур у цэлым.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – пазнаёміць студэнтаў з сучаснымі вядучымі літаратуразнаўчымі школамі і канцэпцыямі замежнай філалогіі, іх асноўнымі метадалагічнымі прынцыпамі і палажэннямі, каб будучы спецыяліст абгрунтавана падыходзіў да выбару метадалогіі ўласнай навукова-даследчай працы.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

1. сфарміраваць у студэнтаў уяўленні аб асноўных падыходах замежнага літаратуразнаўства да аналізу мастацкага тэксту;
2. вывучыць гісторыю фарміравання і зместу найбольш важных паняццяў і катэгорый замежных філолагаў;
3. навучыць студэнтаў адрозніваць тыпы метадалагічных сістэм, прынятыя ў замежным літаратуразнаўстве, свабодна аперыраваць паняційна-тэрміналагічным інструментарыем;
4. фарміраваць уменні і навыкі прафесійнага літаратуразнаўчага аналізу твораў мастацкай літаратуры;
5. развіваць індывідуальна-творчае і аналітычнае мысленне студэнтаў;
6. выпрацоўваць навыкі напісання літаратурна-крытычных прац (анатацыі, рэцэнзіі на мастацкі твор).

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Вучэбная дысцыпліна «Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» адносіцца да модуля «Літаратуразнаўства» і ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі.

Вучэбная дысцыпліна «Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Параўнальнае літаратуразнаўства», «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Тэорыя літаратуры».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць**:

– асноўныя сучасныя літаратурныя напрамкі, плыні, школы, стылі;
– літаратурныя жанры, сродкі мастацкай выразнасці;
– тэрміны, паняцці і катэгорыі, якія характарызуюць метадалагічную парадыгму сучаснага літаратуразнаўства;
– важнейшыя сучасныя метады аналізу мастацкага твора;
– этапныя літаратуразнаўчыя працы;
– сутнасныя заканамернасці развіцця літаратурнай тэорыі;

**умець**:

– арыентавацца ў сучаснай літаратуры па тэорыі і метадалогіі навукі;
– аналізаваць літаратурна-крытычныя і тэарэтыка-метадалагічныя канцэпцыі з выяўленнем уласнай пазіцыі;
– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай, бібліяграфічнымі крыніцамі і сучаснымі пошукавымі сістэмамі па электронных архівах цэнтральных кнігасховішч;
– аналізаваць розныя ўзроўні мастацкага тэксту;
– выяўляць асноўныя гісторыка-тыпалагічныя і функцыянальныя разнавіднасці літаратурнай творчасці;
– суадносіць мастацкі тэкст з літаратурным напрамкам, плынню, школай, стылем;

**валодаць**:

– метадалогіяй комплекснага аналізу мастацкага тэксту;
– навыкамі аналізу мастацкага тэксту як цэласнага феномена;
– навыкамі кампаратыўна-тыпалагічнага вывучэння літаратур.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліне «Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступнай кампетэнцыі:

СК 11. Прымяняць асноўныя метады і прыёмы аналіза літаратурнага тэксту з мэтай цэласнага ўяўлення пра яго моўную, культуралагічную і гістарычную сутнасць.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і

практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сучаснае замежнае літаратуразнаўства» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 108 гадзін, з іх 50 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 24 гадзіны, практычныя заняткі – 26 гадзін. На самастойную работу студэнтаў адведзена 58 гадзін.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 залiковыя адзінкі.

Прамежкавая форма атэстацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме экзамена ў V семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Структуралізм

***Тэма 1.1 Гісторыя і храналагічныя межы структуралізму.***

Храналагічныя межы структуралізму Структуралізм як адметны тып чалавечай практыкі. Роля пражскага лінгвістычнага гуртка і жэнеўскай лінгвістычнай школы ў фарміраванні структуралізму. Асноўныя паняцці структуралізму: а) значэнне тэрміну *структура*; б) паняцці *функцыя, элемент, узровень, апазіцыя;*в) знакі і сімвалы.

Погляды Я. Мукаржоўскага: структурная даміnanта і норма. К. Леві-Строс: паняцце структуры твора і яе прыкметы.

***Тэма 1.2 Структуралізм у Расіі***

Значэнне прац А.Ф.Лосева (праца «Знак. Символ. Миф»). Мір літаратуры як знакавая сістэма мовы. Узнікненне тартуска-маскоўскай школы (маскоўскі семіятычны рух (Вяч. Вс. Іваноў, В.Н.Топараў, А.К.Жалкоўскі, Е.М.Мелецінскі, Б.А.Успенскі і інш.). Эвалюцыя школы, яе трактоўка *тэксту*. Семіётыка тексту і семіётыка культуры. Праца Б.А.Успенскага «Поэтика композиции». Тартуская семіятычная школа (Ю.М.Лотман, Т.В.Цывьян, З.Г.Мінц і інш.). Паняцце тексту ў семіётыцы тартускай школы.

***Тэма 1.3 Погляды Ю.М.Лотмана на структурны метад***

Ю.М.Лотман як «новы тып рускага культурнага чалавека», «homo semioticus». Дзейнасць Ю.М.Лотмана, яго погляды на структурны метад: а) тэорыя і практыка структурнага аналізу вучонага; б) паняцце *тэкст* («Лекции по структуральной поэтике» і «Структура художественного текста»). Тэкст культуры. Семіятычная неаднароднасць тэксту. Тэкст у тэксце; в) тэрміны *мінус–прыём, дамінанта, пазатэкставыя сувязі*; г) канцэпцыя семіясферы.

***Тэма 1.4 Асэнсаванне меж і магчымасцей структуралізму***

Крытычнае асэнсаванне меж і магчымасцей структуралізму (М.Бахцін, П.Рыкер, Р.Барт, Ж.Дэрыда). Праблема «тэксту ў тэксце». Нараталогія як пасрэднік паміж структуралізмам і постструктуралізмам. Узнікненне нараталогіі – тэорыі тэкстаў у межах структуралізму (П.Лабок, Н.Фрыдман, А.-Ж.Грэймаас, Ж.Жэнет, В. Шмід). Тэрміналагічны апарат нараталогіі.

***Тэма 1.5 Структурная нараталогія ў Францыі. Чыкагская школа***

Структурная нараталогія ў Францыі: парыжская семіялагічная школа (Р.Барт, К.Леві-Строс, Ц.Тодараў, А.Грэймаас, К.Брэмон, Ж.Жэнет, Ю. Крысцева і інш.). Чыкагская школа (У.Бут, Р.Скоўлз). Тыпалогія пунктаў гледжання (Я.Лінтвельт, Ж.Жэнет).

## Раздзел 2. Постструктуралізм

***Тэма 2.1 Логіка руху ад структуралізму да постструктуралізму***

Структуралісцкая (Ю.Лотман) і постструктуралісцкая (Ю.Крысцева) трактоўкі тэксту і інтэртэксту. Філасофскія асновы постструктуралізму. Метадалагічныя ўстаноўкі і асноўныя паняцці постструктуралізму. Крытыка дыскурсіўных практык (М.Фуко).

***Тэма 2.2 Семіялагічныя школы***

Парыжская семіялагічная школа (Р.Барт, К.Леві-Строс, Ц.Тодараў, А.Грэймаас, К.Брэмон, Ж.Жэнет, Ю.Крысцева і інш.) і бельгійская школа сацыялогіі літаратуры (Л. Гольдман і інш.). Крытыка традыцыйнай канцэпцыі знака (Ж.Дэрыда).

***Тэма 2.3 Навуковы шлях Р.Барта***

Навуковы шлях Р.Барта. Тры перыяды навуковай творчасці Р. Барта. Паняцці *пісьмо, сацыялект, дыскурс.* Ад структурнага аналізу да тэкставага (версія Р.Барта).

***Тэма 2.4 Тэорыя М. Бахціна***

Навуковая спадчына М.М. Бахціна. Ідэя М.Бахціна пра ўнутраную дыялагічнасць тэксту (слова). Кола М.М. Бахціна (П.Н.Мядзведзеў, Л.В.Пумпянскі). Асноўныя накірункі сучаснай бахціналогіі. Разбурэнне паэтыкі: ад Бахціна – да поструктуралізму (Ю. Крысцева). Інтэртэкст Ю.Крысцевай і Р.Барта.

***Тэма 2.5 Інтэртэкстуальны аналіз***

Праблема літаратурных крыніц і параўнальна-гістарычнае вывучэнне мастацкага твора. Тыпы інтэртэкстаў. Тыпы прэтэкстаў і тыпы сувязяў тэксту і прэтэксту. Механізм утварэння літаратурных кантэкстаў і інтэртэкстаў: цытаты, рэмінісцэнцыі, алюзіі.

## Раздзел 3. Дэканструктывізм

***Тэма 3.1 Дэканструктывізм як навуковы накірунак канца XX ст.***

Гісторыя ўзнікнення. Асноўныя напрамкі дэканструктывізму: йельская школа, герменеўтычны накірунак, левы дэканструктывізм, феміністкая крытыка. Дэканструкцыя як метад аналізу тэксту, тэхніка дэканструкцыі.

***Тэма 3.2 Дэканструктывізм і Ж.Дэрыда***

Граматалогія Ж.Дэрыды як агульная тэорыя пісьма (праца «Пра граматалогію»). Гіпотэза пра «архіпісьмо». Дэканструкцыя і тэкставы аналіз. Дэканструктывізм і культура постмадэрнізму.

## Раздзел 4. Літаратурная герменеўтыка і рэцэптыўная эстэтыка

***Тэма 4.1 Найноўшая літаратурная герменеўтыка***

Найноўшая літаратурная герменеўтыка ў працах Э.Д.Хірша. Канцэпцыя лінгвакультурнай граматнасці Э.Д.Хірша. Класіфікацыя культурнай граматнасці. Слоўнік Э.Д.Хірша. Праблема «герменевтического круга»: гісторыя ўзнікнення тэрміну, яго змест і праблема тлумачэння. Герменеўтычныя ідэі М.М.Бахціна, Д.С.Ліхачова.

***Тэма 4.2 Станаўленне і развіццё рэцэптыўнай эстэтыкі***

Асноўныя прынцыпы рэцэптыўнай эстэтыкі. Канцэпцыя Х.Р.Яўса. Камунікатыўная прырода стасункаў паміж тэкстам і чытачом. Экспліцытны і імпліцытны чытач. Сэнс паняцця *горизонт ожидания.* Канцэпцыя «открытого произведения» У.Эка: межы мастацтва, іх рухомасць, мабільная структура.

## Раздзел 5. Фенаменалагічныя школы. Міфалагічная крытыка. Псіхааналіз

***Тэма 5.1 Прадстаўнікі фенаменалагічнай школы***

Метадалагічныя прынцыпы фенаменалогіі. Фенаменалагічная школа і экзістэнцыялізм.Твор як феномен аўтарскай свядомасці (Ж.-П. Сартр). Школы: рэцэптыўная крытыка (школа рэакцыі чытача): асноўныя прынцыпы рэцэптыўнай крытыкі ў працы В. Ізера «Неопределенность и читательская реакция в прозе», крытыка свядомасці (жэнеўская школа), школа крытыкаў Буфало.

***Тэма 5.2 Тэорыя міфа ў XX ст.***

Канцэпцыя міфа ў гуманітарыстыцы XX ст. Спецыфіка сучаснага міфа. Тэорыя міфа ў XX ст. (А.Ф. Лосеў, Р. Барт, Я.М. Мелецінскі і інш.). Міфалагічная крытыка ў Еўропе і ЗША. Метадалогія школы. Два напрамкі ў развіцці міфалагічнай крытыкі: англійскі (Дж.Фрэйзер, Р.Грэйвс), амерыканскі (працы Р.Чэйза і Н.Фрая).

***Тэма 5.3 Псіхааналіз і літаратура***

Асноўныя прынцыпы літаратуразнаўчага псіхааналізу. Экзістэнцыяльны псіхааналіз (Ж.-П.Сартр, А.Мальро), структуральны псіхааналіз (Ж.Лакан, Р.Барт, Ж.Дэрыда). Псіхааналіз у сучасным літаратуразнаўстве (І.Д.Ермакоў, А.І.Белкіна, А.І.Кулікова, М.М.Рашэтнікава, С.М.Чаркасава і інш.): пераасэнсаванне прац З.Фрэйда сучаснымі літаратуразнаўцамі (І.П.Смірноў); псіхіятрычны аналіз персанажаў (К.Леангард, В.П.Руднеў) і ўсяго тэксту (В.П.Бялянін).

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ « СУЧАСНАЕ ЗАМЕЖНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА»

(дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдытор-ных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| **1.** | **Структуралізм** | **5** | **6** | **12** | | | |
| **1.1** | ***Гісторыя і храналагічныя межы структуралізму*** | 2 | 2 | 2 | | | |
| 1.1.1. | ***Гісторыя і храналагічныя межы структуралізму***<br>1. Храналагічныя межы структуралізму Структуралізм як адметны тып чалавечай практыкі.<br>2. Роля пражскага лінгвістычнага гуртка і жэнеўскай лінгвістычнай школы ў фарміраванні структуралізму. | 2 | | | Мультымедыйная прэзентацыя | Асн. [1] [2] Дад. [2] [3] [6] | Выступленне з паведамленнямі. |
| 1.1.2. | ***Асноўныя паняцці структуралізму***<br>1. Ззначэнне тэрміну структура; паняцці функцыя, элемент, узровень, апазіцыя; знакі і сімвалы.<br>**2.** Погляды Я. Мукаржоўскага: структурная дамінанта і норма. К. Леві-Строс: паняцце структуры твора і яе прыкметы. | | 2 | | | Асн. [2] Дад. [2] [3] [6] | Аналіз твораў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.2.** | ***Структуралізм у Расіі*** | | 2 | 2 | | | |
| | 1. Значэнне прац А.Ф.Лосева (праца «Знак. Символ. Миф»). Мір літаратуры як знакавая сістэма мовы.<br>2. Узнікненне тартуска-маскоўскай школы (маскоўскі семіятычны рух (Вяч. Вс. Іваноў, В.Н.Топараў, А.К.Жалкоўскі, Е.М.Мелецінскі, Б.А.Успенскі і інш.). Эвалюцыя школы, яе трактоўка тэксту.<br>3. Семіётыка тексту і семіётыка культуры. Праца Б.А.Успенскага «Поэтика композиции».<br>4. Тартуская семіятычная школа (Ю.М.Лотман, Т.В.Цывьян, З.Г.Мінц і інш.). Паняцце тексту ў семіётыцы тартускай школы. | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. Навуковыя працы Б.Успенскага і Ю.Лотмана | Асн. [1] [2] Дад. [2] [3] [7] | Вуснае апытванне. Тэсціраванне ў СДН MOODLE http://elib.bspu.by/handle/doc/2136 |
| **1.3.** | ***Погляды Ю.М.Лотмана на структурны метад*** | | 2 | 2 | | | |
| | 1. Ю.М.Лотман як «новы тып рускага культурнага чалавека», «homo semioticus».<br>2. Дзейнасць Ю.М.Лотмана, яго погляды на структурны метад: а) тэорыя і практыка структурнага аналізу вучонага; б) паняцце тэкст («Лекции по структуральной поэтике» і «Структура художественного текста»).<br>3. Тэкст культуры. Семіятычная неаднароднасць тэксту. Тэкст у тэксце; в) тэрміны мінус–прыём, дамінанта, пазатэкставыя сувязі; г) канцэпцыя семіясферы. | | | | Навуковая праца Ю.Лотмана «Структура художественного текста» | Асн. [1] [2] Дад. [2] [3] [7] | Выступленне з паведамленнямі. |
| **1.4.** | ***Асэнсаванне меж і магчымасцей структуралізму*** | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Крытычнае асэнсаванне меж і магчымасцей структуралізму (М.Бахцін, П.Рыкер, Р.Барт, Ж.Дэрыда). Праблема «тэксту ў тэксце».<br>2. Нараталогія як пасрэднік паміж структуралізмам і постструктуралізмам. Узнікненне нараталогіі – тэорыі тэкстаў у межах структуралізму (П.Лабок, Н.Фрыдман, А.-Ж.Грэймаас, Ж.Жэнет, В. Шмід).<br>3. Тэрміналагічны апарат нараталогіі. | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. Навуковая праца М.Бахціна. | Асн. [1] [2] Дад. [2] [3] [6] | Выступленне з паведамленнямі. |
| **1.5.** | ***Структурная нараталогія ў Францыі. Чыкагская школа*** | 1 | | 4 | | | |
| | 1. Структурная нараталогія ў Францыі: парыжская | | | | Ілюстрацыйны | Асн. | Рэйтынгавая |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | семіялагічная школа (Р.Барт, К.Леві-Строс, Ц.Тодараў, А.Грэймаас, К.Брэмон, Ж.Жэнет, Ю.Крысцева і інш.).<br>2. Чыкагская школа (У.Бут, Р.Скоўлз).<br>3. Тыпалогія пунктаў гледжання (Я.Лінтвельт, Ж.Жэнет). | | | | матэрыял | [1]<br>[2]<br>Дад.<br>[2]<br>[3]<br>[11] | кантрольная работа № 1 |
| **2.** | **Постструктуралізм** | **5** | **6** | **12** | | | |
| **2.1.** | ***Логіка руху ад структуралізму да постструктуралізму*** | 3 | | 4 | | | |
| | 1.Структуралісцкая (Ю.Лотман) і постструктуралісцкая (Ю.Крысцева) трактоўкі тэксту і інтэртэксту.<br>2.Філасофскія асновы постструктуралізму. Метадалагічныя ўстаноўкі і асноўныя паняцці постструктуралізму.<br>3.Крытыка дыскурсіўных практык (М.Фуко). | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. | Асн.<br>[1]<br>[2]<br>Дад.<br>[3]<br>[4]<br>[6] | Вуснае апытванне |
| **2.2.** | ***Семіялагічныя школы*** | | 2 | | | | |
| | 1. Парыжская семіялагічная школа (Р.Барт, К.Леві-Строс, Ц.Тодараў, А.Грэймаас, К.Брэмон, Ж.Жэнет, Ю.Крысцева і інш.)<br>2. Бельгійская школа сацыялогіі літаратуры (Л.Гольдман і інш.).<br>3. Крытыка традыцыйнай канцэпцыі знака (Ж.Дэрыда). | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. Мастацкія тэксты ў трактоўцы семіятычнай школы | Асн.<br>[1]<br>[2]<br>Дад.<br>[3]<br>[10] | Выступленне з паведамленнямі. |
| **2.3.** | ***Навуковы шлях Р.Барта*** | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Навуковы шлях Р.Барта.<br>2. Тры перыяды навуковай творчасці Р. Барта. Паняцці пісьмо, сацыялект, дыскурс.<br>3. Ад структурнага аналізу да тэкставага (версія Р.Барта). | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. | Асн.<br>[2]<br>Дад.<br>[3]<br>[5]<br>[6] | Экспрэс-апытанне. Праверка бібліяграфічнага спіса прац Р.Барта |
| **2.4.** | ***Тэорыя М. Бахціна*** | | 2 | 4 | | | |
| | 1. Навуковая спадчына М.М.Бахціна.<br>2. Ідэя М.Бахціна пра ўнутраную дыялагічнасць тэксту (слова). Кола М.М. Бахціна (П.Н.Мядзведзеў, Л.В.Пумпянскі).<br>3. Асноўныя накірункі сучаснай бахціналогіі. Разбурэнне | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. Бахціналогія. | Асн.<br>[1]<br>[2]<br>Дад. | Вуснае апытванне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | паэтыкі: ад Бахціна – да поструктуралізму (Ю. Крысцева).<br>4. Інтэртэкст Ю.Крысцевай і Р.Барта. | | | | | [3]<br>[10] | |
| **2.5.** | ***Інтэртэкстуальны аналіз*** | | 2 | 2 | | | |
| | 1. Праблема літаратурных крыніц і параўнальна-гістарычнае вывучэнне мастацкага твора.<br>2. Тыпы інтэртэкстаў. Тыпы прэтэкстаў і тыпы сувязяў тэксту і прэтэксту.<br>3. Механізм утварэння літаратурных кантэкстаў і інтэртэкстаў: цытаты, рэмінісцэнцыі, алюзіі. | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. Інтэртэкст Ю.Крысцевай | Асн.<br>[1]<br>[2]<br>Дад.<br>[3]<br>[10] | Вуснае апытванне. Творчае заданне |
| **3.** | **Дэканструктывізм** | **5** | **4** | **10** | | | |
| **3.1.** | ***Дэканструктывізм як навуковы накірунак канца XX ст.*** | 5 | | 5 | | | |
| | 1. Гісторыя ўзнікнення.<br>2. Асноўныя напрамкі дэканструктывізму: йельская школа, герменэўтычны накірунак, левы дэканструктывізм, феміністкая крытыка.<br>3. Дэканструкцыя як метад аналізу тэксту, тэхніка дэканструкцыі. | | | | Мультымедыйная прэзентацыя | Асн.<br>[2]<br>Дад.<br>[6]<br>[7] | Выступленне з паведамленнямі. |
| **3.2.** | ***Дэканструктывізм і Ж. Дэрыда*** | | 4 | 5 | | | |
| | 1. Граматалогія Ж.Дэрыды як агульная тэорыя пісьма (праца «Пра граматалогію»).<br>2. Гіпотэза пра «архіпісьмо». Дэканструкцыя і тэкставы аналіз.<br>3. Дэканструктывізм і культура постмадэрнізму. | | | | Тэкставы аналіз. | Асн.<br>[1]<br>[2]<br>Дад.<br>[7] | Даклады |
| **4.** | **Літаратурная герменеўтыка и рэцэптыўная эстэтыка** | **4** | **6** | **12** | | | |
| **4.1.** | ***Найноўшая літаратурная герменеўтыка*** | 4 | | 6 | | | |
| | 1. Найноўшая літаратурная герменеўтыка ў працах Э.Д.Хірша. Канцэпцыя лінгвакультурнай граматнасці Э.Д.Хірша.<br>2. Класіфікацыя культурнай граматнасці. Слоўнік Э.Д.Хірша.<br>3. Праблема «герменевтического круга»: гісторыя ўзнікнення тэрміну, яго змест і праблема тлумачэння. | | | | Мультымедыйная прэзентацыя. | Асн.<br>[1]<br>[2]<br>Дад.<br>[4]<br>[6]<br>[7] | Аналіз твораў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.1.1. | 1. Герменеўтычныя ідэі М.М. Бахціна,<br>2. Герменеўтычныя ідэі Д.С.Ліхачова. | | 2 | | | Асн. [2] Дад. [1] [2] | Аналіз твораў |
| **4.2.** | ***Станаўленне і развіццё рэцэптыўнай эстэтыкі*** | | 4 | 6 | | | |
| | 1. Асноўныя прынцыпы рэцэптыўнай эстэтыкі.<br>2. Канцэпцыя Х.Р.Яўса. Камунікатыўная прырода стасункаў паміж тэкстам і чытачом. Эксплiцытны і імпліцытны чытач. Сэнс паняцця *горизонт ожидания*.<br>3. Канцэпцыя «открытого произведения» У.Эка: межы мастацтва, іх рухомасць, мабільная структура. | | | | Мультымедыйная прэзэнтацыя. Праца У.Эка “Открытое произведение” | Асн. [2] Дад. [2] [7] | Выступленне з паведамленнямі. Тэсціраванне ў СДН MOODLE http://elib.bspu.by/handle/doc/2136 |
| **5.** | **Фенаменалагічныя школы. Міфалагічная крытыка. Псіхааналіз** | **5** | **4** | **12** | | | |
| **5.1.** | ***Прадстаўнікі фенаменалагічнай школы*** | 2 | | 4 | | | |
| | 1. Метадалагічныя прынцыпы фенаменалогіі.<br>2. Фенаменалагічная школа і экзістэнцыялізм. Твор як феномен аўтарскай свядомасці (Ж.-П. Сартр).<br>3. Школы: рэцэптыўная крытыка (школа рэакцыі чытача): асноўныя прынцыпы рэцэптыўнай крытыкі ў працы В.Ізера «Неопределенность и читательская реакция в прозе», крытыка свядомасці (жэнеўская школа), школа крытыкаў Буфало. | | | | Мультымедыйная прэзэнтацыя. Праца В.Ізера «Неопределенность и читательская реакция в прозе» | Асн. [1] [2] Дад. [2] [8] | Вуснае апытванне. Творчае заданне |
| **5.2.** | ***Тэорыя міфа ў ХХ ст.*** | 1 | 2 | 4 | | | |
| | 1. Канцэпцыя міфа ў гуманітарыстыцы ХХ ст. Спецыфіка сучаснага міфа.<br>2. Тэорыя міфа ў ХХ ст. (А.Ф. Лосеў, Р. Барт, Е.М. Мелецінскі і інш.). Міфалагічная крытыка ў Еўропе і ЗША.<br>3. Метадалогія школы.<br>4. Два напрамкі ў развіцці міфалагічнай крытыкі: англійскі (Дж.Фрэйзер, Р. Грэйвс), амерыканскі (працы Р.Чэйза і Н.Фрая). | | | | Мультымедыйная прэзэнтацыя. Праца Е.Мелецінскага “Миф и сказка” | Асн. [1] [2] Дад. [5] [7] | Выступленне з паведамленнямі. |
| **5.3.** | ***Псіхааналіз і літаратура*** | 2 | | 4 | | | |
| | 1. Асноўныя прынцыпы літаратуразнаўчага псіхааналізу.<br>2. Экзістэнцыяльны псіхааналіз (Ж.-П.Сартр, А.Мальро), | | | | Мультымедыйная прэзэнтацыя. | Асн. [1] | Рэфераты, прэзэнтацыі |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | структуральны псіхааналіз (Ж.Лакан, Р.Барт, Ж.Дэрыда). | | | | | [2] Дад. [8] [12] | |
| 5.3.1. | 1. Псіхааналіз у сучасным літаратуразнаўстве (І.Д.Ермакоў, А.І.Белкіна, А.І.Кулікова, М.М.Рашэтнікава, С.М.Чаркасава і інш.): пераасэнсаванне прац З.Фрэйда сучаснымі літаратуразнаўцамі (І.П.Смірноў); псіхіятрычны аналіз персанажаў (К.Леангард, В.П.Руднеў) і ўсяго тэксту (В.П.Бялянін). | | 2 | | Мультымедыйная прэзэнтацыя. | Асн. [1] [2] Дад. [7] [12] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| | **УСЯГО** | **24** | **26** | **58** | | | **Экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. История зарубежной литературы XX века : програм.-метод. материалы : пособе для студентов вузов / сост. Н. Л. Сержант. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2018. – 147 с.

2. История зарубежной литературы (история зарубежной литературы XIX века) : учеб.-метод. комплекс для специальностей 1-02 03 02 «Русский язык и литература», 1-02 03 04 «Русский язык и литература. Иностранный язык (с указанием языка)» / сост. Т. Е. Комаровская // Репозиторий БГПУ. – URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/2136 (дата обращения: 09.04.2025).

**Дадатковая літаратура**

1. Гаспаров, М. Л. М. М. Бахтин в русской культуре XX века / М. Л. Гаспаров // Вторичные моделирующие системы : сб. ст. / Тартус. гос. ун-т ; отв. ред. Ю. М. Лотман. – Тарту, 1979. – С. 111–114.

2. Козлов, А. С. Зарубежная литература и литературоведение : избр. ст. / А. С. Козлов. – Симферополь : Симферопол. гор. тип., 2009. – 220 с.

3. Кристева, Ю. Избранные труды: разрушение поэтики : пер. с фр. / Ю. Кристева. – М. : Росспэн, 2004. – 656 с.

4. Мелетинский, Е. М. Миф и сказка / Е. М. Мелетинский // Фольклор и этнография : сб. ст. / отв. ред. Б. Н. Путилов. – Л., 1970. – С. 139–148.

5. Мукаржовский, Я. Искусство как семиологический факт / Я. Мукаржовский // Исследования по эстетике и теории искусства / Я. Мукаржовский ; вступ. ст. Ю. М. Лотмана. – М., 1994. – С. 190–198.

6. Мукаржовский, Я. Структуральная поэтика : сборник / Я. Мукаржовский ; вступ. ст. Ю. М. Лотмана. – М. : Яз. рус. культуры, 1996. – 481 с.

7. Современное зарубежное литературоведение: страны Западной Европы и США: концепции, школы, термины : энцикл. справ. / А. В. Дранов, И. П. Ильин, А. С. Козлов [и др.] ; науч. ред.-сост.: И. П. Ильин, Е. А. Цурганова. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Интрада, 1999. – 320 с.

8. Тарасова, Е. В. Традиции готического романа в прозе США XIX – первой трети XX веков (Э. А. По, А. Бирс, Г. Ф. Лавкрафт) : монография / Е. В. Тарасова. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2022. – 126 с.

9. Успенский, Б. А. Поэтика композиции / Б. А. Успенский. – СПб. : Азбука, 2000. – 348 с.

10. Фатеева, Н. А. Контрапункт интертекстуальности, или Интертекст в мире текстов / Н. А. Фатеева. – М. : Агар, 2000. – 280 с.

11. Французская семиотика: от структурализма к постструктурализму : пер. с фр. / сост. и вступ. ст. Г. К. Косикова. – М. : Прогресс, 2000. – 536 с.

12. Шмид, В. Нарратология / В. Шмид. – М. : Яз. славян. культуры : Кошелев, 2003. – 312 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «СУЧАСНАЕ ЗАМЕЖНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА»

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца адным з найважнейшых і найбольш эфектыўных элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на самастойнае авалоданне студэнтам часткай дысцыпліны пры дапамозе спецыяльна распрацаванага навукова-метадычнага забеспячэння, якая прадугледжвае арганізацыю дадатковых кансультацый і спецыяльных відаў кантролю з боку выкладчыка, акрамя прадугледжаных вучэбным планам форм прамежкавага і выніковага кантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў: развіццё ўнутраных псіхалагічных механізмаў інтэлектуальнай актыўнасці студэнтаў, іх пазнавальных здольнасцей шляхам уключэння ў ініцыятыўную вучэбную і навукова-прафесійную дзейнасць, павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Віды самастойнай працы студэнтаў:

а) рэпрадуктыўная (вучэбная, кансультацыйная), якая ўключае выкананне заданняў з вучэбнай літаратуры.

б) прадуктыўная (даследчая), якая ўключае выкананне навукова-даследчай работы; вывучэнне, анатаванне, рэферыраванне дадатковай вучэбнай літаратуры; падрыхтоўку да канферэнцый і г.д.

Формы самастойнай работы студэнтаў: падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў; вывучэнне вучэбных дапаможнікаў; вывучэнне тэм і праблем, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі; падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў і дакладаў; складанне бібліяграфіі. і рэферыраванне па самастойна вывучанай тэме.

## Прыкладны пералік і кароткая характарыстыка ацэначных сродкаў

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
